● СЛОВА — ВЕТЭРАНУ

# БЫЦЬ АПТЫМІСТАМІ І БАРАЦЬБІТАМІ

**жадае сённяшняй моладзі ветэран партыі, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Герой Савецкага Саюза, былы супрацоўнік універсітэта Аляксандр Васільевіч КІРСАНАЎ, інтэрв'ю з якім мы прапаноўваем чытачам.**

**— Аляксандр Васільевіч, які эпізод з Вашай ваеннай біяграфіі запомніўся Вам на ўсё жыццё?**

— Багатая ў мяне ваенная біяграфія — ад грамадзянскай вайны да Вялікай Айчыннай. Ёсць што ўспомніць, аб чым расказаць. Вы, напэўна, чакаеце расказаў пра баі, смелыя вылазкі і іншыя аперацыі? А для мяне самы дарагі ўспамін звязаны не са стрэльбай — з кнігай. Было гэта ў дваццатыя гады, я — баец Чырвонай Арміі, адзін з дваццаці пісьменных у падраздзяленні на амаль 100 неадукаваных. Часам тыя, хто не ўмеў ні чытаць, ні пісаць, не вельмі і саромеліся гэтага, маўляў, страляць можам, а тая навука... Без яе жылі, не гаравалі. Але камандзіры нашы меркавалі інакш. І 17 сакавіка 1920 года на сходзе, дзе я быў выбраны кандыдатам у члены партыі бальшавікоў (тады гэта называлася «спачуваючы»), атрымаў сваё першае партыйнае даручэнне: навучыць чытаць матроса-бальшавіка.

Можа для вас, маладых, гэта і дзіўна, але заданне выканаць было няпроста. Паспрабуй сталага чалавека прымусіць сесці за буквар. Спачатку вучань мой нават крыўдзіўся: «Што за жартачкі такія, «А»—«Б» нейкія, ты чытаць вучы, а не здзекуйся». Я спрабаваў неяк так пабудаваць заняткі, каб яму лягчэй было зразумець, што літары — гэта не проста знакі на паперы. «Памятаеш, — пытаюся, — як дзіця малое крычыць, калі маці няма?» «Ну, — адказвае, — памятаю: у-а». «Вось гэта і ёсць літары. Першая, сам сказаў, — «у», — тлумачу і тут жа на паперы яе пішу, каб лепш запомніў. Потым успамінаем, як дзяўчаты ў лесе перагукваюцца, калі суніцы ці грыбы збіраюць, потым яшчэ якія-небудзь знаёмыя сітуацыі ў літары пераводзім. Авалодаў-такі граматай мой матрос. Ён быў першым. А далей—болей. І не было для мяне большай радасці, як убачыць, што замест прывычнага крыжа выводзіць мой вучань няроўныя ад залішняга старання літары прозвішча.

Што, не зусім баявы эпізод вам расказаў? Зусім не баявы, але, шчыра кажучы, іменна за такую маю «асветніцкую дзейнасць» і паважалі мяне таварышы. А ваяваць? Ваяваць мы ўсе ўмелі.

**— Вы — удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Раскажыце, калі ласка, пра найбольш памятныя падзеі, звязаныя з гэтай аперацыяй.**

— Самае памятнае?.. Днепр. Фарсіраванне Дняпра. Званне Героя Савецкага Саюза атрымаў за гэту аперацыю. Хаця, не зусім дакладна. Мяркую, не толькі за канкрэтныя ваенныя дзеянні высокімі званнямі адзначаюць — за ўменне кіраваць людзьмі таксама. У той дывізіі, якой я камандаваў, яшчэ 46 чалавек сталі Героямі Савецкага Саюза.

Я, калі сустракаюся з піянерамі, заўсёды задаю ім такое пытанне: «Ці слухаеце вы сваіх бацькоў з першага разу?» У адказ — смех. Маўляў, што вы такое гаворыце, хто гэта з першых слоў слухаецца! Мне не трэба было паўтараць байцам загад некалькі разоў. Вялікае пачынаецца з дробязей.

**— Як, на Ваш погляд, сённяшняе маладое пакаленне нясе эстафету, прынятую ад Вашага пакалення?**

— Паспрабуйце выйсці на вуліцу і спытаць у любога прахожага, як ён працуе. Упэўнены, што адкажа: «Добра». І ў 99 выпадках са 100 гэта будзе праўдай. Паглядзіце тэлевізар, пачытайце газеты, і мне не трэба будзе адказваць на ваша пытанне. Мы падарылі сённяшняму пакаленню мір, вам — яго захоўваць. Больш адказнай задачы не ведаю.

Можа, вам пакажацца гэта ўхіленнем ад тэмы, але вось аб чым хачу яшчэ пагаварыць з маладымі: Аб каханні. Так, так. І думаю, што маю на гэта права. З жонкай сваёй, Аленай Пятроўнай, жывём у згодзе вось ужо 54 гады. Не сварыліся, думаеце? Бывала па-рознаму. Спрачаемся і зараз. Але нязгоды праходзяць, а каханне... Трэба, каб яно заставалася. Мяне яшчэ мая бабка вучыла: «Уступай жонцы сто разоў на капейку, а на рубель — ні разу!» Вучыцеся ўступаць. Часцей за ўсё бытавыя сваркі — з-за дробязей, на капейку. Не яны галоўнае. Мы скрозь вайну разам прайшлі і цану каханню ведаем. Вось такую эстафету, вам, маладым, прыняць бы. Эстафету спачування, дабраты, клопату, узаемаразумення.

**— Як Вы лічыце, што больш за ўсё дапамагае выхаванню пачуцця адказнасці ў студэнцтва?**

— У лістападзе 1922 года наша дывізія стаяла ў Екацерынаслаўскай акрузе. Жылі, самі разумееце, бедна. Якія там умовы — рэчмяшок пад галаву, шынель пад сябе, вось і ўвесь камфорт. У адзін са звычайных восеньскіх дзён я, як камандзір узвода, праводзіў заняткі. Раптам адчыняюцца дзверы, і на парозе... Міхаіл Васільевіч Фрунзе. Прывітаўся за руку. Дазволіў працягваць. Паслухаў. Потым сам распачаў размову. Аб самых будзённых справах пытаў: што ядзім, як адпачываем. Нехта паскардзіўся: няма ў нас пасцельнай бялізны. Фрунзе паабяцаў: «Будзе, шэфы вашы паклапаціліся ўжо. Чакайце». Як сказаў, так і атрымалася. Хутка выдалі нам бялізну.

Для чаго я ўсё гэта расказваю? Для таго, каб было зразумела: адказны чалавек той, хто можа дакладна і канкрэтна адказаць па справах, якімі займаецца, паабяцаць і выканаць абяцанне. А вучыць гэтаму як? Перш за ўсё, самому трэба вучыцца.

**— Як Вы ўяўляеце сабе подзвіг ва ўмовах сучаснасці?**

— Магчыма, прагучыць парадаксальна, але галоўнае зараз — вучыцца думаць. Вельмі лёгка спажываць інфармацыю, а вось перапрацоўваць... Не ў кожнага, на жаль, паяўляецца такое жаданне.

**— Ці была ў Вашым жыцці сустрэча з газетай, якая дапамагла фарміраванню Вашага характару?**

— Нейкую асобную, напэўна, не вылучу, але ведаю, што чытаць у газеце карысна не толькі апошнюю старонку...

**— Што б Вы пажадалі чытачам газеты — студэнтам і супрацоўнікам універсітэта?**

— Быць аптымістамі і барацьбітамі. Жывіце радасна і не апускайце рукі пры няўдачах. Памятайце: жыццё — заўсёды чыставік, дзе памылкі выправіць няпроста, а часам і немагчыма.

ЗАПІСАЛА Н. КАЛІШЭВІЧ.

**Набліжаецца 40-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 40-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Рэдакцыя газеты «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» просіць ветэранаў адказаць на пытанні анкеты, якая друкуецца ніжэй.**

**АНКЕТА**

**1. Які эпізод з Вашай ваеннай біяграфіі запомніўся Вам на ўсё жыццё?**

**2. Калі Вы ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, раскажыце, калі ласка, пра найбольш памятныя падзеі, звязаныя з гэтай аперацыяй.**

**3. Як, на Ваш погляд, сённяшняе маладое пакаленне нясе эстафету, прынятую ад Вашага пакалення?**

**4. Як Вы лічыце, што больш за ўсё дапамагае выхаванню пачуцця адказнасці ў студэнцтва?**

**5. Як Вы ўяўляеце сабе подзвіг ва ўмовах сучаснасці?**

**6. Ці была ў Вашым жыцці сустрэча з газетай, якая дапамагла фарміраванню Вашага характару?**

**7. Што б Вы пажадалі чытачам газеты — студэнтам і супрацоўнікам універсітэта?**

● СЛОВА — ЛЕНІНСКАМУ СТЫПЕНДЫЯТУ



**МІНУЛАЯ ВАЙНА забрала 50 мільёнаў жыццяў. Але з чым можна параўнаць сусветную ядзерную катастрофу? Яна стане гібеллю для ўсяго жывога на зямлі. Да яе падштурхоўваюць чалавецтва тыя, хто цяпер ля парога нашага дома размяшчае ядзерныя ракеты, хто пагражае нам «крыжовым паходам».**

**Аднак ёсць сілы, здольныя супрацьстаяць вайне. Аб гэтым з усёй прынцыповасцю сказана ў Заяве таварыша Ю. У. Андропава, у яго словах аб тым, што наша краіна зробіць усё магчымае, каб захаваць мір для цяперашніх і будучых пакаленняў.**

**Пэўны ўклад у гэтую важную справу ўносяць і студэнты універсітэта — удзельнічаюць у антываенных маніфестацыях, мітынгах, уносяць сродкі ў Савецкі фонд міру. Чвэрць сваёй стыпендыі я таксама пералічваю ў гэты Фонд.**

**Маладым, як кажуць, належыць будучыня. Мы павінны зрабіць усё, каб не была яна абпаленай ядзерным пажарам.**

**І. ЗЫБАЙЛА,**
**студэнт факультэта журналістыкі,**
**ленінскі стыпендыят.**

**НА ЗДЫМКУ: І. ЗЫБАЙЛА.** Фота **С. Плыткевіча.**

## АЛІМПІЯДА ЗАКОНЧЫЛАСЯ — ПОШУК ПРАЦЯГВАЕЦЦА

ЗАЛА ХВАЛЯВАЛАСЯ. Праз некалькі хвілін павінна пачацца заключнае пасяджэнне III тура Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па праграміраванню і ЭВМ. На працягу чатырох дзён вялася ўпартая барацьба паміж удзельнікамі алімпіяды. А зараз аўтарытэтнае журы павінна назваць імёны пераможцаў.

Ужо ў другі раз Беларускі універсітэт шчыра прымае гасцей з Азербайджана і Арменіі, Малдавіі і Украіны, Грузіі і Казахстана, якія прыязджаюць, каб праверыць свае веды ў практычнай рабоце. Усе ўдзельнікі алімпіяды падзяляюцца на дзве групы: універсітэты і эканамічныя ВНУ, інжынерна-тэхнічныя і сельскагаспадарчыя ВНУ. Адпаведна ў групах вызначаюцца пераможцы. На гэты раз спаборнічаючым было прапанавана выканаць чатыры заданні.

— Гэтыя заданні,—гаворыць А. В. Самусенка, намеснік дэкана ФПМ, — мы падбіралі так, каб студэнт мог паказаць свае тэарэтычныя веды ў рашэнні канкрэтных задач, а таксама праявіць асабістую творчасць і ініцыятыву ў выбары шляхоў і методыкі іх выканання. Шмат было цікавых, своеасаблівых работ. У параўнанні з мінулым годам значна ўзрос навуковы ўзровень удзельнікаў алімпіяды.

Але не толькі ўпартай барацьбой, жаданнем перамагчы запомніцца алімпіяда гасцям беларускай сталіцы. Шэсць дзён, праведзеных у Мінску, былі напоўнены рознымі мерапрыемствамі, незабыўнымі сустрэчамі.

— Да алімпіяды мы рыхтаваліся старанна, — гаворыць сакратар камітэта камсамола ФПМ Людміла Панчанка,—імкнуліся скласці праграму так, каб нашы госці больш даведаліся аб Беларусі, каб убачылі яе сённяшні дзень і зазірнулі ў мінулае, таму і прапанавалі экскурсіі па гораду, паездкі на Курган Славы і ў Хатынь. Вялікую дапамогу аказвалі нашым гасцям студэнты-гіды М. Афанасьева, Г. Галавінская, Т. Бергман, Я. Любарская. Думаю, што надоўга запомняцца і сустрэчы ў студэнцкім клубе навукі і мастацтва «Красавік» нашага факультэта.

І вось настаў час, калі трэба падводзіць вынікі. Першае месца сярод групы універсітэтаў і эканамічных ВНУ заняла каманда Масквы, другое — Украіны, трэцяе—Беларусі. Наш універсітэт прадстаўлялі лепшыя студэнты факультэта прыкладной матэматыкі В. Аўтушка, Ю. Царковіч, А. Осіпава, К. Косціна. У гэтай групе ў асабістым заліку перамог А. Любімаў (г. Масква). Перамогі ў групе інжынерна-тэхнічных і сельскагаспадарчых ВНУ дабілася каманда Масквы, каманды Беларусі і Украіны падзялілі другое і трэцяе месцы. Пераможца гэтай групы — студэнт Маскоўскага інстытута нафта-хімічнай і газавай прамысловасці Д. Гершуні.

Алімпіяда завяршылася. Яна стала добрым святам для ўсіх удзельнікаў. Пасля гэтага свята зноў пачнуцца працоўныя будні, зноў пачнецца пошук.

А. МАТУСЕВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

● МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

## «ЖЫВЁМ СЯРОД СЯБРОЎ»

**«Савецкі Саюз стаў нашай другой Радзімай, хаця мы жывём тут толькі два месяцы». Гэтыя словы я пачуў пры сустрэчы ад Дзімітрыаса Тэадарыдзіса і Міхаліса Індрэаса, якія прыехалі з Грэцыі ў Мінск, каб вучыцца на падрыхтоўчым факультэце для замежных грамадзян. Я папрасіў іх адказаць на некалькі пытанняў.**

**— Дзімітрыас, што ты ведаў пра СССР раней?**

— Мне, як члену Камуністычнай партыі Грэцыі, вельмі цікава пабываць у першай краіне сацыялізму, даведацца пра яе мінулае і сённяшняе. У сябе на Радзіме я шмат чуў аб нястомнай барацьбе савецкага народа за мір на ўсёй зямлі. І мне захацелася ўбачыць гэта, як кажуць, увачавідкі, пазнаёміцца з савецкімі людзьмі, іх традыцыямі і звычкамі. За такі кароткі тэрмін я паспеў пераканацца ў іх ветлівасці, добразычлівасці і шчырасці як на прыкладзе студэнтаў (а сярод іх у мяне ўжо ёсць сябры), так і зусім незнаёмых мне людзей.

**— Міхаліс, раскажы, калі ласка, як прайшлі твае першыя месяцы ў Мінску?**

— Напачатку ў нас было шмат праблем. Але з дапамогай нашых выкладчыкаў і савецкіх сяброў мы іх хутка вырашылі. Мне падабаюцца адносіны савецкіх людзей адзін да аднаго, а таксама да нас, замежных студэнтаў. Дзякуючы гэтаму першыя месяцы майго жыхарства ў Мінску, нягледзячы на цяжкасці з мовай (таксама зусім не ведаем горад), прайшлі цудоўна.

**— Чаму вы вырашылі прыехаць вучыцца ў СССР?**

— Мы прыехалі па накіраванню Камуністычнай партыі Грэцыі. Але нам і самім вельмі хацелася вучыцца ў навучальных установах СССР. Тут можна набыць добрыя веды. Гэта па-першае. Па-другое, мы хацелі лепш пазнаёміцца з жыццём савецкага народа, больш падрабязна вывучыць яго вопыт у будаўніцтве сацыялізму і камунізму. Наша мэта — пасля вяртання на Радзіму прапагандаваць ідэі камунізму, расказаць нашаму народу праўду пра Савецкі Саюз.

**БАРДУНІАС НІКАЛАОС,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

# УМОВЫ ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ ФАКУЛЬТЭТАМІ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

**Агульнауніверсітэцкая камісія па сацыялістычнаму спаборніцтву разгледзела пытанне аб далейшым удасканаленні сацыялістычнага спаборніцтва ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна ў святле патрабаванняў, акрэсленых у пастанове ЦК КПСС «Аб удасканаленні арганізацыі, практыкі падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва і заахвочвання яго пераможцаў» і рэкамендацый міжвузаўскай навукова-практычнай канферэнцыі «Аб далейшым удасканаленні сацыялістычнага спаборніцтва ў вышэйшых навучальных установах сістэмы МінВНУ СССР» (Баку, 1983 г.).**

**Камісія прыняла рашэнне, якое абавязвае камісіі па сацыялістычнаму спаборніцтву факультэтаў і іншых падраздзяленняў правесці падвядзенне вынікаў спаборніцтва ў гэтым годзе з улікам патрабаванняў пастановы ЦК КПСС і рэкамендацый Бакінскай канферэнцыі, якія нацэльваюць удзельнікаў спаборніцтва на дасягненне высокіх канчатковых вынікаў, скарачэнне агульнай колькасці паказчыкаў і распаўсюджанне перадавога вопыту.**

**Прафсаюзнаму камітэту даручана арганізаваць у школе прафсаюзнага актыву вывучэнне пастановы ЦК КПСС і рэкамендацый Бакінскай канферэнцыі.**

**Прызнана неабходным унесці частковыя змены і дапаўненні ў існуючыя ўмовы падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва паміж факультэтамі з улікам патрабаванняў пастановы ЦК КПСС і рэкамендацый Бакінскай канферэнцыі.**

**У прыватнасці, скарачаецца агульная колькасць паказчыкаў, якія ўлічваюцца пры падвядзенні вынікаў, рэзультаты агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку НДРС уключаюцца ў III раздзел, уводзіцца некалькі новых паказчыкаў.**

**У адпаведнасці з прынятай пастановай фкультэты даюць зыходныя даныя для падвядзення вынікаў спаборніцтва па I раздзелу ў аддзел аспірантуры, па II — у вучэбны аддзел, а па III — у НДЧ да 25 снежня гэтага года. Названыя службы правяраюць правільнасць пададзеных зыходных даных і забяспечваюць адзінства патрабаванняў.**

**Канчатковае рашэнне па выніках сацыялістычнага спаборніцтва факультэтаў прымаецца агульнауніверсітэцкай камісіяй у студзені наступнага года.**

**Дадатковыя прапановы па ўдасканаленню апублікаваных умоў просім накіроўваць у прафком універсітэта.**

## МЕТОДЫКА ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ СПАБОРНІЦТВА

Вынікі сацыялістычнага спаборніцтва падводзяцца па наступных чатырох раздзелах:

1. Падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў. Павышэнне кваліфікацыі.
2. Навукова - метадычная, вучэбна - метадычная работа.
3. Навукова - даследчая работа.
4. Грамадска - палітычная і арганізацыйна - масавая работа.

Выніковае месца факультэта вызначаецца па суме месц па ўсіх чатырох раздзелах.

Унутры кожнага раздзела месца факультэта вызначаецца па суме месц па ўсіх пунктах раздзела з улікам іх каэфіцыентаў значнасці і вагавых каэфіцыентаў, калі дадзены пункт утрымлівае падпункты.

Зыходныя даныя па I раздзелу рыхтуе аддзел аспірантуры і аддзел кадраў, па II раздзелу — вучэбны аддзел і ВМЦ, па III — НДЧ і па IV раздзелу — прафком. Зыходныя даныя падаюцца ў прафком не пазней як 5 студзеня. Праект рашэння рыхтуе прафсаюзны камітэт. Канчатковае рашэнне прымаецца агульнауніверсітэцкай камісіяй па сацыялістычнаму спаборніцтву.

## РАЗДЗЕЛ I

## ПАДРЫХТОЎКА НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫХ КАДРАЎ, ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ

### ПАКАЗЧЫКІ

1. Колькасць прафесараў і дактароў навук на факультэце з разліку на 1 чалавека выкладчыкаў, якія маюць вучоную ступень кандыдата навук больш за 10 гадоў (1).

2. Колькасць доктарскіх дысертацый, абароненых супрацоўнікамі факультэта ў справаздачным годзе з разліку на 1 чалавека навукова-педагагічнага саставу, якія маюць вучоную ступень кандыдата навук больш за 10 гадоў (6).

3. Колькасць аспірантаў дзённай і завочнай формы навучання і спабoрнікаў, якія абаранілі кандыдацкія дысертацыі, адносна агульнай колькасці выпушчаных у справаздачным годзе аспірантаў і спабoрнікаў (2).

4. Колькасць кандыдацкіх дысертацый, абароненых супрацоўнікамі факультэта (выключаючы п. 3) з разліку на 1 чалавека навукова - педагагічнага саставу, якія не маюць вучоных ступеней (3).

5. Выкананне плана прыёму ў аспірантуру (1):

а) дзённай формы навучання (2);

б) завочнай формы навучання (1).

6. Колькасць выкладчыкаў, з разліку на 1 чалавека, адкамандзіраваных для чытання лекцый (2):

а) за мяжу (3);

б) у ВНУ СССР (2).

## РАЗДЗЕЛ II

## НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ І ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ РАБОТА

### ПАКАЗЧЫКІ

1. Выкананне плана выпуску спецыялістаў (вызначаецца адносінай колькасці выпускнікоў да ліку прынятых на першы курс дадзенага выпуску (2).

2. Колькасць рэкамендаваных ДЭКамі да ўкаранення (друку) дыпломных работ адносна агульнай колькасці работ, абароненых выпускнікамі (3).

3. Колькасць студэнтаў, якія атрымалі дыплом з адзнакай, з разліку на 1 выпускніка факультэта (4).

4. Выдадзена ў справаздачным годзе падручнікаў і вучэбна - метадычных дапаможнікаў з разліку на 1 чалавека прафесарска - выкладчыцкага саставу (5):

а) праз цэнтральныя выдавецтвы (3);

б) праз рэспубліканскія выдавецтвы (2);

в) унутрыуніверсітэцкія (1).

5. Колькасць навукова-метадычных артыкулаў і тэзісаў, надрукаваных выкладчыкамі з разліку на 1 чалавека (3):

а) ва ўсесаюзнай прэсе (3);

б) у рэспубліканскай прэсе (2);

в) у двух выданнях (1).

6. Арганізацыя і правядзенне навукова - метадычнай канферэнцыі (4):

а) усесаюзнай (3);

б) рэспубліканскай (2);

в) універсітэцкай і іншых (1).

7. Вынікі агляду-конкурсу па выкарыстанню ТСН у вучэбным працэсе (5).

8. Прыбыло выпускнікоў да месца работы па размеркаванню ў вызначаны тэрмін адносна агульнай колькасці размеркаваных (4).

9. Колькасць маладых спецыялістаў, аб рабоце якіх атрыманы станоўчы водгук — (%) (5):

а) пасля першага года работы (2);

б) пасля другога года работы (1).

## РАЗДЗЕЛ III

## НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА

### ПАКАЗЧЫКІ

1. Колькасць манаграфій, надрукаваных у справаздачным годзе, з разліку на 1 чалавека навукова - педагагічнага саставу (6):

а) ва ўсесаюзных выдавецтвах і за мяжой (2);

б) у іншых выдавецтвах (1).

2. Колькасць надрукаваных навуковых артыкулаў і тэзісаў з разліку на 1 чалавека навукова - педагагічнага саставу (2):

а) ва ўсесаюзных і замежных выданнях (2);

б) у рэспубліканскіх выданнях (1).

3. Арганізацыя і правядзенне факультэтам навуковай канферэнцыі, семінара і г. д. (4):

а) усесаюзных і міжнародных (3);

б) рэспубліканскіх (2);

в) іншых (1).

4. Структура дзяржбюджэтных і гаспадарча-дагаворных НДР (3):

а) колькасць НДР, якія выконваюцца па заданнях дырэктыўных органаў, адносна агульнай колькасці НДР (3);

б) колькасць навукова-даследчых работ, якія выконваюцца па планах АН СССР і АН БССР, адносна агульнай колькасці НДР (2);

в) колькасць НДР, якія выконваюцца па міжвузаўскіх мэтавых навукова-тэхнічных праграмах, адносна агульнай колькасці НДР (1);

г) колькасць НДР, якія выконваюцца па дагаворах аб супрацоўніцтве і ў рамках вучэбна - навукова - вытворчых аб'яднанняў, адносна агульнай колькасці НДР (1).

5. Ацэнка работ, выкананых супрацоўнікамі ВНУ, выражаная ў (6):

а) прысуджэнні ўсесаюзных прэмій (6);

б) прысуджэнні рэспубліканскіх прэмій (4);

*** Лічбы ў дужках — каэфіцыенты значнасці і вагавыя каэфіцыенты.**

в) выдачы дыпломаў на адкрыццё (5);

г) атрыманні патэнта (2);

д) продажы ліцэнзіі (5);

е) атрыманні аўтарскага пасведчання (1).

6. Адносіны пацверджанага вытворчасцю эканамічнага эфекта да агульных затрат на НДР (4).

7. Вынікі агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку НДРС (4).

8. Колькасць работ, вынікі якіх у мінулым годзе ўкаранёны ў прамысловасць і ў вучэбны працэс (4).

## РАЗДЗЕЛ IV

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ І АРГАНІЗАЦЫЙНА-МАСАВАЯ РАБОТА

### ВЫНІКІ АГЛЯДАЎ-КОНКУРСАЎ

— камсамольскіх арганізацый факультэтаў — адказны за правядзенне камітэт камсамола;

— прафсаюзных студэнцкіх арганізацый — адказны за правядзенне студэнцкі прафком;

— студэнцкай мастацкай самадзейнасці — адказны за правядзенне клуб універсітэта;

— студэнцкіх будаўнічых атрадаў — адказны за правядзенне камітэт камсамола;

— сельскагаспадарчых атрадаў — адказны за правядзенне камітэт камсамола;

— насценнага друку — адказны за правядзенне партком;

— нагляднай агітацыі — адказны за правядзенне партком;

— спартакіяды «Здароўе» — адказны за правядзенне прафком;

— спартыўна - масавай работы — адказны за правядзенне спортклуб універсітэта;

— абарэнна - масавай работы — адказны за правядзенне камітэт ДТСААФ;

— ДНД — адказны за правядзенне штаб ДНД;

— прафілактыкі правапарушэнняў — адказны за правядзенне савет прафілактыкі;

— прапаганды грамадска-палітычных і навуковых ведаў — адказны за правядзенне праўленне таварыства «Веды»;

— прафбюро факультэтаў па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва — адказны за правядзенне прафком;

— мастацкай самадзейнасці супрацоўнікаў — адказны за правядзенне прафком.

**Умовы падвядзення вынікаў сацспаборніцтва зацверджаны агульнауніверсітэцкай камісіяй па сацыялістычнаму спаборніцтву 10 лістапада 1983 года.**

# Ружовы ранак

*Літаратурная старонка*

## З НАШАЙ ПОШТЫ

Сёлета споўнілася 60 гадоў з пачатку творчасці выдатнага майстра беларускай прозы Кузьмы Чорнага. (Прынамсі нагадаць, што першае апавяданне Мікалая Рамаsuccessоўскага, надрукаванае ў 1923 годзе пад псеўданімам Кузьма Чорны, называлася «На граніцы»). Неацэнная заслуга пісьменніка ў справе развіцця беларускай савецкай літаратуры. Даследаванню яго творчасці студэнты-філолагі прысвячаюць свае курсавыя і дыпломныя работы, іх цікавіць, захапляе Чорны-празаік, Чорны-псіхолаг, Чорны-чалавек.

І яшчэ адна знамянальная дата з жыцця класіка, якая датычыць непасрэдна нас, студэнтаў універсітэта. Вераснёўскімі днямі мінула 60 гадоў з таго дня, калі Мікалай Раманоўскі стаў студэнтам літаратурна-лінгвістычнага аддзялення педфака БДУ. Шкада, што з-за хваробы тут доўга правучыцца яму не давялося. Знаходзячыся ў час вайны ў Маскве, Чорны клапаціўся пра адкрыццё асобнага факультэта журналістыкі пры нашым універсітэце.

Мой верлібр — даніна ўдзячнасці Чорнаму за яго вялікі талент — талент шчырасці.

**Аляксандр БЕЛЬСКІ,**

студэнт філфака

# РОЗДУМ НАД ДЗЁННІКАВЫМ ЗАПІСАМ

### ПАМЯЦІ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА

*«Родныя мае мясціны! Як мая душа рвецца туды! Яна заўсёды там. Там жывуць усе мае персанажы. Усе дарогі, пейзажы, дрэвы, хаты, чалавечыя натуры, пра якія я калі-небудзь пісаў. Гэта усё адтуль, сапраўднае...»*

(З дзённіка Кузьмы Чорнага).

I.

Чацвёртага ліпеня сорак чацвёртага года.
Хворай рукой у дзённіку зроблены запіс
Сынам, што змарнеў у пакутах
Па роднай зямлі, па сваёй Беларусі.
Масква! Ты голасам цвёрдым, праўдзівым,
Як маці, ягонае сэрца натхніла,
Прыліў новых сіл і моц яму надала.
Вільготныя вочы... «Дзякуй, маці-сталіца,
За прытулак, за трывожныя дні,
За бяссонныя ночы...
А мне трэба хутчэй у Беларусь,
Дзе мястэчка маленькае ёсць, —
Цімкавічы... Мая душа рвецца туды!..»

II.

Шчасце! Якое вялікае шчасце!
Ён едзе дамоў, да сваіх дарагіх землякоў.
Яны, цімкаўцы, заўсёды з ім побач былі,
Усе доўгія чатыры гады крывавай вайны
Іх твары ў памяці яго паўставалі,
Калі пісаў раманы ці гаварыў з сябрамі,
З Купалам у Печышчах, слухаючы зводку,
З беларускімі партызанамі,
Што ў Маскву прыязджалі...
Ён едзе ў Цімкавічы! Ён шчаслівы!..

III.

Разбураны Мінск сустрэў яго сумна.
«Горад будзе цвісці, ён паўстане як фенікс,
Бо рэхам грыміць пераможнае заўтра!» —
Напаўняе вера вялікае сэрца яго.
Ды толькі хвароба жалезнай рукою
Бязлітасна горла здавіла.
...А восень паўнаўладна ў правы ўступае,
Сняцца спелыя слуцкія бэры,
Лес Скіп'еўскі ўвесь залаты...
І раптам — светлая радасць, смутак і боль
Навечна на твары прыгожым застылі...

IV.

Крыўдна так, не даехаў дадому...
Не сустрэў яго шчыры дружбак Лявон Жук.
Ды, здаецца, хлушу я! Ён вярнуўся!
Я ўчора ля школы мясцовай бачыў яго
На сваім юбілеі сярод сясцёр,
Сяброў па пяру, цімкаўцоў!
Вяргінь букет ускладаў яму Заір Азгур,
Унучак Коля дзедаву кніжку гартаў...
Так, ён вярнуўся!.. Вялікі пісьменнік,
Слава вёскі, Сумленне і Памяць яе!

**Валянціна МІСЮК.**

студэнтка філфака

### ЭЛЕГІЯ

Загінула маленькая рака...
Маленькая — не так ужо і
страшна,
Пазбавіліся музыкі
ўчарашняй:
Ці ж ёй, малой, на долю
наракаць?
Калі б вялікая... Плач пад
глухія бомы
Жалобны ранак да душы
данёс.
Згадалася: з маленькай,
невядомай
Ракі вялікай пачынаўся
лёс.

### БЯДА

А я адчувала,
Як кепска табе,
А я разумела,
Як цяжка.
І не магла
Працягнуць далонь,
Баялася, раптам скажаш:
«Навошта? Я дужы,
Я сам змагу
З бядою сваёю справіцца».
Я ж так хацела,
Каб ты прыйшоў...
Прыйшоў да мяне параіцца.



Члены літаратурнага аб'яднання «Узлёт» на беразе Свіслачы. Фотаэцюд С. Плыткевіча.

**Вольга САВАСЦЮК,**

студэнтка філфака

* * *

Сваё багацце восень зноў развесіла
І напаіла водарам сады,
А толькі ўсё нявесела, нявесела,
І не пазбавіцца сумоты і нуды,
А дождж шліфуе золата асенняе,
І моўчкі плачуць кветкі пад сцяной,
Губляючы апошняе насенне,
Каб парастак тугі прарос вясной.

* * *

Я ў лесе ажываю, я жыву!
Я дыхаю яго густым настоем,
Які прыемна тлуміць галаву.
Нас двое тут, тут лес і я, нас двое.

**Марына КАРЫЦКАЯ,**

студэнтка журфака

* * *

*Я бачу, як вецер зрывае з дрэў лісты,*
*І кружыць, верціць іх, кідае на мокры асфальт.*
*Яны спрачаюцца з ім — ды ўсё дарэмна.*
*Вецер яшчэ хутчэй падганяе іх*
*І нясе невядома куды.*
*Мне шкада іх, але я не магу нічым дапамагчы ім.*
*А яны ўсё ляцяць і ляцяць.*
*Дык няхай жа гэтыя лісты будуць лістамі дадому,*
*Якія мы яшчэ не напісалі.*

**Сяргей КАВАЛЁЎ,**

студэнт філфака

* * *

Ты вернешся. Не будзе слоў.
Адплоціш радасцю і смехам.
Пачуцці паслухмяным рэхам
Надзеяй адгукнуцца зноў.
Сваю тугу пакінеш там.
Калі ж не здолееш — не трэба.
Дажджом святым пральецца
неба
І змые, што не змыць гадам.
І будзе свет, як адкрыццё,
І кветкі запалаюць важка,
І як бы не было нам цяжка,
Няўзгодам не спыніць жыццё.

* * *

Ты — чужая і далёкая
Ад самой сябе.
Ты смяешся, яснавокая,
А душа ў журбе.
Не ўратуеш родную
Ад маркотных дум.
З сэрца кроў халодную
Смокча сум.

**Алена ЗАБАРОНАК,**

студэнтка філфака

### ВОСЕНЬ

Раніца. Возера.
Цудна як восенню!
Сонейка ранняе
У сінь яго глянула.
Клёны пад сонейкам
Шэпчуцца тоненька.
Хваляць, ружовыя,
Куртачкі новыя.
Сню цябе, можа, я,
Чуеш, прыгожая?..

* * *

Зорным золкам паднімуся
Па знаёмай сцежцы зноў.
Закружуся, засмяюся
Харастве птушыных моў.
Раптам — месячык
за хвоі
Бы схаваецца знарок,
Знікнуць зоркі, быццам
хто іх
Замалюе ў сіні змрок.
Запяю, заплачу, змоўкну...
Тут — дзяцінства,
І за мной
Заіскрыцца зорны золак
Зруч са сталасцю маёй.

**Сяргей ЧЫГРЫН,**

студэнт філфака

### ДУША

Душа спявае ад душы,
Калі вясна, настрой,
каханне...
Умей яе заварушыць
Сваім чуллівым
хваляваннем.
Душа не ведае прыпынку,
Яе цікавіць свет жывы.
Яна спявае безупынку,
Калі заўжды з душою вы!

* * *

Поры года —
Ансамбль:
Вясна — баян,
Лета — арган,
Восень — ударнік,
Зіма — кларнет.
Пражыты год —
Мелодыя,
Жыццё — канцэрт...

* * *

На заранку ў барвовай
цюбецейцы
Глядзіць сланечнік жоўтай
галавой,
Матуля ранак прынясла
ў сенцы —
У даёнцы цёплы, свежы
сырадой.
Вазьму гладыш і промнем
спаласну,
І басаногж па росах —
у суніцы.
Хачу ў лесе сярод траў
і сасняку
Той чысціні на цэлы дзень
напіцца.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

1 снежня 1983 г.

Зак. 2032. АТ 04584.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ